# Памяці вучонага

## БАРЫС ВАСІЛЬЕВІЧ СТРАЛЬЦОЎ



18 кастрычніка 2009 г. перастала біцца сэрца доктара філалагічных навук, прафесара, заснавальніка навуковай школы беларускай журналістыкі Барыса Васільевіча Стральцова. Пайшоў з жыцця выдатны педагог, настаўнік, светлы, душэўны чалавек.

Б.В. Стральцоў нарадзіўся 1 сакавіка 1926 г. у в. Хутар Быхаўскага раёна. Перад пачаткам вайны скончыў 8 класаў Чавускай сярэдняй школы, а 9-ы – толькі ў 1950 г., падчас службы ў арміі (шэсць гадоў салдацкай службы – ад радавога да старшага сяржанта). Праз год, ужо ў вячэрняй школе ў Бабруйску, атрымаў сярэднюю адукацыю, скончыўшы 10-ы клас са срэбным медалём. З 1951 па 1956 г. вучыўся на філалагічным факультэце БДУ (два курсы – завочна, тры – стацыянарна, увесь час сумяшчаючы вучобу з работай у рэдакцыях газет). Быў літаратурным работнікам тагачаснай бабруйскай абласной газеты «Савецкая Радзіма», літработнікам, загадчыкам аддзела газеты «Чырвоная змена», з 1958 па 1969 г. – літработнікам, загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда». З верасня 1969 г. на факультэце журналістыкі БДУ – старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, прафесар кафедры сацыялогіі журналістыкі, а пасля – перыядычнага друку.

З першым журналісцкім творам – рэпартажам «Агнявы рубеж» Б.В. Стральцоў выступіў у 1948 г. на старонках газеты «Советская Армия», якая выдавалася Групай савецкіх войскаў у Германіі. З таго часу Б.В. Стральцоў апублікаваў сотні публіцыстычных і мастацкіх твораў. Працуючы ва універсітэце, выдаў дзесяткі вучэбных дапаможнікаў і манаграфій, навуковых брашур і артыкулаў. Сярод іх – «Газета і мараль», «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Аналітычныя жанры», «Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства», «Дзесятая пяцігодка ў беларускім нарысе», «Фельетон. Теория и практика жанра», «Основы публицистики. Жанры», «Свет и тени», «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці», «Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы» і інш. Пад кіраўніцтвам Б.В. Стральцова больш 20 суіскальнікаў абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

На пісьменніцкім рахунку Б.В. Стральцова раман «Між крутых берагоў», аповесці і зборнікі апавяданняў «Наследнік», «Сходзяцца бальшакі і прасёлкі», «Вячэрняя планета», «Метраном памяці», «Чарадзейны туман». Усе творы пісьменніка прываблiваюць тым, што ён глыбока пранікае ў сутнасць жыццёвых працэсаў, псіхалагічна дакладна спасцігае людскія лёсы, у чым яму дапамагала, акрамя пісьменніцкага таленту, багатая журналісцкая практыка.

Творчы партрэт Б.В. Стральцова дапаўняецца аўтарствам чатырох сцэнарыяў дакументальных фільмаў і пяці мастацка-публіцыстычных альбомаў, прысвечаных Беларусі.

Навуковая і педагагічная дзейнасць Барыса Васільевіча была высока ацэнена. Ён узнагароджаны граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1962, 1965, 1986). З'яўляецца лаўрэатам прэміі Міжнароднай канфедэрацыі журналісцкіх саюзаў «За адметны ўклад у развіццё журналістыкі» (1992), лаўрэатам прэміі Беларускага саюза журналістаў «За выдатны ўклад у развіццё беларускай журналістыкі» (1995), Заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь (1997), лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыі «Журналістыка» (2001).

Спалучэнне даследчыцкай, выкладчыцкай і публіцыстычнай дзейнасці прафесара Б.В. Стральцова адзначана нагруднымі знакамі Міністэрства адукацыі і Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку – «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «Выдатнік друку Беларусі». Барыс Васільевіч, тым не менш, не любіў, калі яго называлі карыфеем, мэтрам, легендай беларускай журналістыкі. Ён быў сціплым чалавекам і заўсёды цікавым. Тым, хто ўступаў у журналістыку, раіў перш за ўсё не забываць, што гэты шлях цярністы. Вучыў гаварыць праўду, паважаць людзей – тых, пра каго і для каго пішаш. З гэтай навукай пайшло ў жыццё не адно пакаленне вучняў Барыса Васільевіча.

Памяць пра цудоўнага чалавека назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто ведаў яго і працаваў з ім.

***Калектыў Інстытута журналістыкі БДУ***